*І. П. Клімаў*

# ПРАЛЕГОМЕНЫ Ў АГІЯЛОГІЮ ДАЎНЯЙ БЕЛАРУСІ (XI–XVIII стст.)

Пад агіялогіяй (ад грэч. ἅγιος ‘святы’і λόγος ‘слова, выклад’) разумеецца даследаванне тэалагічных і гісторыка-царкоўных аспектаў святасці. Пры гэтым прырода самой святасці звычайна не разглядаецца (яна складае аб’ект вывучэння тэалогіі), агіялогія засяроджваецца на вывучэнні тыпалогіі святасці і святых, успрымані іх у царкве і грамадстве ў розныя эпохі. Асноўным матэрыялам для агіялогіі служаць агіяграфія, літаратура, гісторыя, а таксама сумежныя дысцыпліны: тэалогія, гісторыя царквы, рэлігіязнаўства і інш. Часам агіялогія атаясамліваецца з агіяграфіяй (ад грэч. ἅγιος ‘святы’ і γράφω ‘пішу’), аднак прадмет вывучэння апошняй дысцыпліны інакшы: гэта літаратурныя тэксты, прысвечаныя святым, тады як агіялогія разглядае не столькі творы, колькі непасрэдна постаць самога святога, тып яго святасці і ўспрыманне яго грамадствам. Тыму крыніцамі агіялогіі служаць не толькі жыцці святых, але і іншыя творы, адрасаваныя ім (у тым ліку літургічныя, царкоўныя), а таксама тэалагічныя трактаты і іншыя літаратурныя творы, што закранаюць тэму святасці.

На беларускім матэрыяле агіялогія пакуль не распрацоўвалася, і існуюць некаторыя сумненні ў правамернасці пастаноўкі і раскрыцця такой тэмы ўвогуле. Хаця ў Старажытнай Беларусі з часоў усталявання хрысціянства шанаваліся розныя святыя, аднак суіснаванне розных канфесій і, галоўнае, адсутнасць царкоўнай самастойнасці ў краіне моцна замінaлі ўсталяванню адзінага кола святых. У старажытнасці не існавала самастойнай Беларускай Царквы, а тэрыторыя Беларусі (у яе сучасных ці этнічных межах) знаходзілася пад царкоўнай юрысдыкцыяй іншых царкоўных цэнтраў, якія змяшчаліся далёка ад Беларусі і разглядалі яе як сваю перыферыю. З гэтай прычыны царкоўнікі краіны даволі рэдка ініцыявалі кананізацыю святых. Прыкладам можа служыць Елісей Лаўрышаўскі, сын літоўскага кн. Трайняты, прыбліжанага кн. Міндоўга. Быў кананізаваны мітрапалітам Іосіфам ІІ Солтанам на саборы ў Вільні ў 1514 г. Святыя Беларусі часцей за ўсё кананізаваліся ў Польшчы ці Рыме або ў Масковіі.

Таму ўзнікае заканамернае пытанне: ці можа існаваць агіялогія Беларусі, калі не існавала Беларускай Царквы? Пры ўсёй

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

правамернасці гэтага пытання адказ на яго будзе, аднак, станоўчым. У межах тэрміна, акрэсленага вышэй, існуе зусім пэўны аб’ект даследавання: склад і лік святых даўняй Беларусі, успрыманне святасці і святых як царкоўнікамі Беларусі, так і астатнімі вернікамі. У дадатак, у адміністрацыйных адносінах Беларусь таксама не была зусім невыразным арэалам. Доўгі час яна (разам з большай часткай Украіны) уваходзіла ў склад Кіеўскай мітраполіі (грэка-праваслаўнай, пазней і ўніяцкай) ці (ужо без Украіны і Берасцейшчыны, але разам з Усходняй Літвой) утварала Віленскае біскупства. Таму ў межах гэтых царкоўных адзінак цалкам магчыма казаць пра існаванне пэўнага кола шанаваных святых, хаця, зразумела, у многім агульных з суседнімі народамі – украінцамі ці літоўцамі.

Высвятленне пытання пра склад і лік святых даўняй Беларусі ўскладнена многімі аб’ектыўнымі цяжкасцямі. Перш за ўсё ўзнікае пытанне: хто можа быць аднесены да святых Беларусі? Апрыёры можна меркаваць, што гэта асобы, якія: а) нарадзіліся на Беларусі і/ці б) дзейнічалі і/або праславіліся тут сваімі подзвігамі, цудамі. Але ці будуць сюды адносіцца асобы, што толькі закрана907 ў сваёй дзейнасці Беларусь, напрыклад, праходзілі (ці маглі праходзіць) праз яе тэрыторыю? Прыкладам можа служыць св. Гіяцынт (црксл. Якінф, польск. Яцэк гербу Адрованж) – каталіцкі місіянер-дамініканец, які ў 1222–26 гг. вандраваў па Русі і ў 1228–32 гг. жыў у Кіеве, дзе нібыта заснаваў царкву і адкуль прынёс алебастравую выяву Маткі Боскай, уратаваўшы яе ад знішчэння татарамі. Невядома, ці наведаў ён на сваім шляху Беларусь. Але яго сувязь з ёй прасочваецца больш выразна пазней, калі беларускія аўтары сталі ўсхваляць яго ў сваіх літаратурных творах. Так, Мікола Гусоўскі стварыў дыдактычна-элегічную паэму «De vita et gestis Divi Hyacinthi» (1525), а Гальяш Пельгрымоўскі апісаў жыцце Гіяцынта ў сваім творы «Heroibus in Dei Ecclesia» (1585). Пытанне, ці ўключаць такія постаці ў склад беларускіх святых, пакуль застаецца адкрытым.

У той жа час вядома нямала выпадкаў, калі народжаныя на Беларусі асобы кананізаваліся і за яе межамі, у тых царкоўных цэнтрах, у юрысдыкцыі якіх знаходзілася Беларусь. Прыкладам можа служыць Параскева (Паракседа), полацкая княжна, дачка Рагвольда (Васіля), што шмат гадоў жыла ў Рыме, дзе і памерла ў 1239 г. і была неўзабаве кананізаваная ў 1273 г.; пазней яе лічылі сястрой Ефрасінні Полацкай.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Як бачна, лік і склад святых Беларусі далёка неадназначны і патрабуе ўсебаковага высвятлення. А калі ўлічваць таксама існаванне царкоўных адзінак, у склад якіх уваходзіла Беларусь, да ліку святых Беларусі, відаць, трэба адносіць і іншых святых, што не былі беларускімі ўраджэнцамі, але шанаваліся ў Кіеўскай мітраполіі і ў Віленскім біскупстве. У гэтым кірунку патрэбныя спецыяльныя размежаванні, каб пазбегнуць непажаданых супярэчлівасцей.

Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што ў пэўныя перыяды Беларусь станавілася аб'ектам спрэчкі розных юрысдыкцый у межах адной канфесіі (напрыклад, Маскоўскага і Канстанцінопальскага патрыярхатаў), лік і склад святых у якіх мог быць розны. Больш таго, на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі розныя канфесіі: а) праваслаўная, б) каталіцкая, в) уніяцкая, г) пратэстанцкая (апошняя ролі не адыгрывала, паколькі адмаўляе святых). Асобныя святыя маглі шанавацца ў розных канфесіях, што ўскладняе падлік святых. Апрыёры можна меркаваць, што павінны быць складзеныя як мінімум два спісы святых даўняй Беларусі: а) праваслаўныя, б) каталіцкія разам з уніяцкімі.

Таксама трэба ўлічваць розную ступень святасці ў розных канфесіях: а) святыя і пакутнікі – у праваслаўі і каталіцтве, б) блаславёныя – у каталіцтве і ўніяцтве і ўгоднікі (ахвярнікі) – у праваслаўі. У дадатак у праваслаўі вызначаецца яшчэ і розны ранг святых: дабраверныя (звычайна гэта ўладары), свяціцелі (звычайна архірэі), патэры, ці прэпадобныя (манахі, пустэльнікі, аскеты), пакутнікі, ці страстацерпцы, цудатворцы, раўнаапостальныя.

Аднак самую вялікую праблему ўтварае пытанне кананізацыі і абшар шанавання святых. Калі ў каталіцызме кананізацыя даволі рана (ужо ў X–XII стст.) склалася як дастаткова фармалізаваная працэдура, якая адбывалася з санкцыі вышэйшых царкоўных структур, то ў праваслаўі і да XVI–XVII стст. кананізацыя заставалася мала фармалізаваным працэсам. Звычайна прылічэнне да ліку святых у Кіеўскай мітраполіі санкцыянавалася на мясцовым саборы вышэйшых царкоўнікаў ці асобнай пастановай епіскапа або мітрапаліта. Аднак часам культ асобных святых мог уводзіцца і Канстанцінопальскім патрыярхам, але заставацца малапашыраным на самой Беларусі – з розных прычын. Гэтак адбылося з трыма Віленскімі пакутнікамі, кананізаванымі ў 1347 г. Канстанцінопальскім патрыярхам Філафеем Коккіным з ініцыятывы Кіеўскага мітрапаліта Кіпрыяна, які перанёс частку іх мошчаў у Канстанцінопаль. Аднак іх жыцце,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

створанае на грэчаскай мове, толькі ў XV ст. было перакладзена на Балканах на царкоўнаславянскую мову, а згадкі пра гэтых святых упершыню трапляюцца ў наўгародскіх летапісах толькі з 2-й паловы XV ст.

Таму лік і склад праваслаўных святых і ўгоднікаў і асабліва даты іх кананізацыі, а таксама дні іх памяці (шанавання) у царкве нават да XVIII-XIX стст. не заўжды пэўныя. Іншы чыннік – паўторныя кананізацыі праваслаўных святых Беларусі ў Маскоўіі, што здольна нарадзіць блытаніну ці разнабой у датах і арэале шанавання. Прыкладам могуць служыць даты шанавання трох Віленскіх пакутнікаў, паўторна кананізаваных у 1549 г. у Маскве. Дні іх памяці – 14 красавіка і 13 ліпеня (перанос мошчаў), але раней адзначаліся аналагічныя даты – 14 студзеня і ў снежні. Таму пры вызначэнні датаў патрэбны абавязковы разгляд самых розных крыніц, каб пазбегнуць блытаніны. Нарэшце, варта ўлічваць, што некаторыя святыя шанаваліся абедзвюма канфесіямі: каталіцкай і праваслаўнай, але кожная з канфесій мела свае даты шанавання, якія маглі блытацца ў наратыўных і навуковых крыніцах.

Паводле літаратурных крыніц вядома, што да афіцыйнага культу часам залічваліся асобы з народных паданняў, а ў народзе шанаваліся сумнеўныя ці апакрыфічныя святыя. Прыкладам можа служыць постаць Меркурыя Смаленскага, пра якога захавалася шмат жыццяў нават у некалькіх рэдакцыях, але з моцнымі фантастычнымі, нават казачнымі сюжэтамі. Ці залічваць такія постаці да ліку святых? Адказ на гэтае пытанне павінны быць станоўчы. І такія постаці немагчыма ігнараваць, паколькі ў іх праяўлялася старажытная хрысціянская традыцыя, калі шанаванне асобных святых узнікала без фармальнай кананізацыі, на падставе народнай пашаны і падання. Задача агіялогіі – не адбіраць найбольш верагоднае кола святых, а толькі ўлічыць усе вядомыя ў пэўным арэале постаці.

У сувязі з гэтым знаходзіцца і праблема вызначэння абшару шанавання беларускіх святых. Паводле царкоўнай традыцыі шанаванне святых магло адбывацца на некалькіх магчымых узроўнях: а) агульнацаркоўны, б) рэгіянальны (у межах мітраполіі ці патрыярхату), в) мясцовы (у межах епархіі ці іншай царкоўнай правінцыі). Аднак у праваслаўнай Русі падзел на агульнацаркоўныя і мясцовашанаваныя святыя позні (з XVIII ст.) і не вельмі строгі, таму тут магчымая блытаніна. Прыкладам можа служыць постаць Кірылы Тураўскага – нягледзячы на папулярнасць яго твораў па

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ўсёй Русі, няма ніякіх доказаў, што ён шанаваўся ў якасці святога за межамі Тураўскай епархіі.

Усё гэта абумоўлівае асаблівую ўвагу да крыніц. Пытанне крыніц у агіялогіі даўняй Беларусі ўвогуле з’яўляецца ці не першаступенным. Тэарэтычна можна вылучыць кола крыніц, што ўтрымліваюць звесткі пра святых: а) святцы (у праваслаўі) ці каталогі (у каталіцтве) – афіцыйныя спісы святых; б) лекцыянарныя зборнікі і табліцы (меналогі, саборнікі, святочнікі (таржэсцвеннікі) і да т. п. тэксты, якія ўтрымліваюць імёны святых з указаннем датаў памяці; в) малітвы і заклінанні, звернутыя да святых; г) дакументы пра кананізацыю і/ці ўсталяванне культу святога (свята ці дня памяці); г) любыя іншыя дакументы ці наратыўныя крыніцы са згадкай імя святога. Аднак праца з гэтымі крыніцамі ў беларускай агіялогіі пакуль нават не пачыналася і знаходзіцца фактычна ў самым зародку.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ